Падтрымай "Вясну" на PATREON

За ўдзел у "Маршы адзінства" мінчукам прысудзілі па два з паловай гады “хіміі”

26.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні



Руслан Цюрлік (злева) на волі

Суд Заводскага раёна Мінска 26 лістапада вынес прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да палітвязня Кірылы Жогалева і Руслана Цюрліка. Абодвух абвінавацілі ў арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо ў актыўным удзеле ў іх (ч.1 арт 342 Крымінальнага кодэкса).

Справу разглядаў суддзя **Алег Каляда**. Дзяржабвінаваўца – пракурор **Мікіта Савіцкі.**

21 верасня 2021 года **Кірыл Жогалеў і Руслан Цюрлік** былі затрыманыя і да суда змешчаныя ў СІЗА №1.

Беларускай праваабарончай супольнасцю Кірыл Жогалеў 13 кастрычніка быў прызнаны палітычным зняволеным.

На папярэднім судовым пасяджэнні 25 лістапада стала вядома, што Кірыл і Руслан 6 верасня 2020 года прынялі ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве – "Маршы адзінства" у Мінску, парушалі пры гэтым грамадскі парадак, стаялі ў счэпцы, выкрыквалі лозунгі, заміналі працы грамадскага транспарту. Разам з калонай мітынгоўцаў у перыяд часу з 13-50 да 18-40 рухаліся па вуліцах Смаленская, Кастрычніцкая плошча, Леніна, Інтэрнацыянальная, Ульянаўская, Кірава, праспект Незалежнасці і плошча Свабоды. Пры гэтым, "*неаднаразова адмовіліся выканаць патрабаванне супрацоўнікаў міліцыі, перакрылі дарогу, чым перашкаджалі руху транспарту*" (былі пералічаныя некалькі дзясяткаў маршрутаў).

На пытанне адваката да прадстаўніка Мінсктранса, чаму ў справе так шмат маршрутаў і няўжо ўсе іх перакрывалі абвінавачаныя, прадстаўніца адказала, што не ўяўляецца магчымым вызначыць, хто дзе перакрываў, таму пералічваюцца ўсе маршруты. Праз гэта "Мінсктранс" не выканаў сваю транспартную працу і свае абавязацельствы.

Сваю віну абвінавачаныя прызналі цалкам і раскаяліся ў сваіх учынках.



Кірыл Жогалеў на волі пасля суда

Жогалеў матэрыяльны пазоў прадпрыемства “Мінсктранс” прызнаў часткова, а Цюрлік адмовіўся катэгарычна.

У судзе былі заслуханыя паказанні шасці сведак – сяброў, сваякоў, калег па працы. Усе яны характарызавалі абвінавачаных станоўча.

Пад час судовых спрэчак 25 лістапада дзяржабвінаваўца заявіў, што віна абвінавачаных даказаная пісьмовымі матэрыяламі справы, іх прызнаннем і прасіў суд пакараць Жогалева і Цюрліка абмежаваннем волі **на два з паловай гады кожнага з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.** Пракурор таксама прасіў задаволіць пазоў прадпрыемства “Мінсктранс” за матэрыяльную шкоду, панесеную спыненнем працы грамадскага транспарту.

Адвакаты, у сваю чаргу, прасілі суд абмежавацца “хатняй хіміяй”.

Суддзя вынес прысуд у поўнай адпаведнасці з прапановай пракурора: **па два з паловай гады абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.** Матэрыяльны пазоў “Мінсктранса” будзе разгледжаны ў парадку грамадзянскай судавытворчасці.

Да ўступлення ў сілу прысуда Жогалеў і Цюрлік былі вызваленыя з-пад варты пад падпіску аб нявыездзе.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды атубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла аніжнальную атаку". Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ

‹ ›



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY